## Мітрапаліт Веніямін:

# «БЕЛАРУСКАЯ ЗЯМЛЯ ЎЗРАСЦІЛА МНОГІХ ПАДЗВІЖНІКАЎ...»

### У гэтым годзе Беларуская Праваслаўная Царква адзначае шэраг юбілейных дат

Так, у маі адбудзецца святкаванне 1020-годдзя Тураўскай епархіі. 125 гадоў адзначыць Гродзенская епархія, 100 – Гомельская. 19–20 мая ў Свята-Успенскім Жыровічскім мітрапаліцкім мужчынскім манастыры пройдуць урачыстасці, прымеркаваныя да 555-годзя з'яўлення цудатворнага Жыровіцкага абраза. У жніўні ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска ўзгадаюць пра яшчэ адну святыню – Мінскую Божую Маці, паводле легенды яе абраз прыплыў па рацэ 525 гадоў таму. 4–5 чэрвеня ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры ў Полацку пройдуць урачыстасці да 900-годдзя храма. Гэтым, а таксама іншым знакавым падзеям была прысвечана канферэнцыя "Асвета беларускіх зямель праз праваслаўную кнігу. Юбілейныя даты Беларускай праваслаўнай царквы", якая прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы.



Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін знаёміцца з кніжнымі навінкамі




Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі выдавецкі савет Беларускай Праваслаўнай Царквы, міністэрствы культуры, адукацыі і інфармацыі, Нацыянальная бібліятэка і Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр.

## У Славу Божую

З даўніх часоў манастыры і прыхадскія храмы станавіліся цэнтрамі адукацыі і культуры. “Беларуская зямля ўзрасціла многіх падзвіжнікаў на ніве духоўна-маральнай асветы”, – заўважыў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін. Калыскай хрысціянства ён назваў Полацк. Станаўленне горада як духоўнага цэнтра і культурны росквіт беларускай зямлі ў XII стагоддзі звязаны з асветніцкай дзейнасцю прападобнай Еўфрасінні Полацкай. “У нашы дні яна застаецца прыкладам духоўнасці, працалюбства і асветніцтва”, – адзначыў мітрапаліт. Святая вялікую ўвагу ўдзяляла перапісванню кніг і навучанню людзей грамаце. Сама яна не пісала духоўных прац, але пакінула пасланне нашчадкам – фрэскі Спаскай царквы Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Яны выкананыя па задуме і пад кіраўніцтвам Еўфрасінні. Нядаўна храм адкрыўся пасля рэстаўрацыі і цалкам раскрытыя ад пазнейшых панаўленняў фрэскі сталі даступныя для вернікаў, паломнікаў, наогул усіх, хто прыйдзе ў храм. Тут паказана цэлая гісторыя багаслоўя. У фрэсках адлюстравана Святое пісанне з яго прароцтвамі і правобразамі, падзеі і запаведзі Новага завета, гісторыя царквы, барацьба з ерасямі. Праз 900 гадоў пасля свайго заснавання Спаса-Ефрасінеўскі манастыр працягвае традыцыі заснавальніцы. Роспісы храма вывучаны, у друкарні полацкага манастыра пабачыла свет прысвечаная ім кніга. Яна дазваляе пазнаёміцца са спадчынай Прападобнай Еўфрасінні, вывучыць сюжэты фрэсак, асэнсаваць іх духоўны змест.

Калі звярнуцца да 1020-гадовай гісторыі Тураўскай епархіі, нельга не ўзгадаць свяціцеля Кірылу Тураўскага. Складзеныя ім тэксты малітваў, пропаведзі, прытчы, пасланні, адрасаваныя звычайнаму чалавеку, для таго, каб узняць над мірскімі праблемамі, прымусіць задумацца аб высокіх ідэалах.

З заснаваннем Гродзенскай епархіі 125 гадоў таму актывізавалася духоўная асвета, вывучэнне мінулага роднага краю. Сталі выходзіць кнігі, брашуры і артыкулы, прысвечаныя гісторыі заходне-беларускіх манастыроў, храмаў.

Сёлета будзе адзначацца і 800-годзе Лаўрышэўскага манастыра. Ён быў заснаваны ў пачатку XIII стагоддзя, у час калі праваслаўныя святары і манахі адыгралі вялікую ролю ў развіцці хрысціянства на нашых землях. Лаўрышэўскі манастыр быў адным з найбуйнейшых праваслаўных храмаў да XVI стагоддзя, у часы ўніяцтва ён прыйшоў у заняпад. Галоўнай духоўнай і культурнай каштоўнасцю манастыра з’яўляецца Лаўрышэўскае Евангелле – рукапісная кніга, якая сёння захоўваецца ў бібліятэцы князёў Чартарыйскіх у Кракаве. Гэта Евангелле ўтрымлівае богаслужэнні і чытанні на ўвесь год ад Вялікадня да Страстной Сядміцы, як гэта было прынята ў час яго стварэння. Старажытная кніга ўтрымлівае чатырнаццаць укладных запісаў, самы ранні датуецца 1329 годам. Святыня стала і дакументам па гісторыі храма, яна адлюстроўвае дзейнасць настаяцеляў, мецэнатаў, іншых асоб, звязаных з храмам.

Цэнтрам духоўнай асветы на беларускіх землях стаў Жыровіцкі манастыр. У бібліятэцы заснавальніка храма і гаспадара жыровіцкага маёнтка Солтана Аляксандравіча, які займаў пасаду гаспадарскага маршалка і слонімскага вялікакняскага намесніка, па стане на 1495 год пералічваюцца шматлікія богаслужэбныя і душакарысныя кнігі. Па заказу Солтана для правядзення багаслужэнняў у храме былі створаны рукапісныя кнігі, якія захаваліся да нашых дзён. У 1550-я гады з’явіўся знакавы помнік царкоўнай кніжнасці – Жыровіцкае Евангелле. Сёння яно захоўваецца ў бібліятэцы акадэміі навук

Літвы. Багацце мастацкага афармлення дазваляе лічыць яго адным з найбольш выдатных кніжных помнікаў праваслаўнага славянскага свету. Сёння Жыровіцкі манастыр працягвае кнігавыдавецкія традыцыі, вывучае і асвятляе старонкі сваёй гісторыі.

Сёлета адзначаецца 565-годдзе Спаскага манастыра ў Кобрыне, які таксама быў адным з духоўных цэнтраў асветы. Паводле дакументальных крыніц, у 1532 годзе ў фондзе манастырскай бібліятэкі пералічваліся розныя царкоўныя і душакарысныя кнігі.

240 гадоў таму заснавана Мінская духоўная семінарыя, старэйшая з вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Сярод яе выпускнікоў не толькі святары, але і вучоныя, дзеячы навукі, культуры і адукацыі.

Да юбілейных дат, якія будуць сёлета адзначацца, адносіцца і 500-годдзе выдання Францыскам Скарынам “Апостала” – апошняй кнігі, якую ён надрукаваў у Вільні.

230 гадоў таму завяршыўся зямны шлях святіцеля Георгія Каніскага – архіепіскапа Магілёўскага, аднаго з самых адукаваных людзей свайго часу. Сорак гадоў служэння ён прысвяціў аднаўленню духоўнага жыцця, праваслаўнай асветы. У 1757 годзе ён заснаваў Магілёўскую духоўную семінарыю. Дзякуючы яму будаваліся храмы, адраджаліся манастыры, з’яўляліся бібліятэкі і сацыяльныя ўстановы. Разам з такой актыўнай грамадскай дзейнасцю ён займаўся прапаведаваннем, ствараў літаратурныя працы, быў перакладчыкам і аўтарам дапаможнікаў па багаслоўю, сам займаўся кнігавыданнем. Сучаснікі называлі яго “непараўнальным прапаведнікам”. Святіцель сабраў адну з найбагацейшых бібліятэк, якая налічвала 1269 кніг і 241 экзэмпляр рукапісаў і дакументаў.

## Роля ў культуры і адукацыі

“Важна помніць, што Царква аказала вялікі ўплыў на фарміраванне культуры і духоўнасці народа, змагла зберагчы многія культурныя скарбы, у тым ліку летапісы і пропаведзі беларускіх святых”, – заўважыў мітрапаліт. Уладыка ўпэўнены, што і сёння важна працягваць тыя традыцыі, якія былі закладзены папярэднікамі. Ролю праваслаўнай кнігі цяжка ацаніць, яна не толькі дапамагае выхоўваць чалавека, пабуджаць у ім добрыя пачуцці, але і дапамагае любіць гісторыю, культуру і традыцыі свайго народа.

“Кніга духоўная заўсёды прывабная, але сучаснаму чалавеку яе трэба паказаць, часам данесці”, – упэўнены Патрыяршы Экзарх.

Добрай традыцыяй у нашай краіне стала святкаванне Дня Праваслаўнай кнігі. Галоўная мэта яго – развіццё цікавасці да праваслаўнай кнігі, прывіванне любові да чытання ў падрастаючага пакалення. Важна праз праваслаўную кнігу далучыць людзей да



тысячагадовай хрысціянскай традыцыі. Мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня Праваслаўнай кнігі, праходзяць у лютым–сакавіку ва ўсіх епархіях Праваслаўнай Царквы, у публічных і царкоўных бібліятэках, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах.
Як адзначыў мітрапаліт, сёння, калі існуюць альтэрнатыўныя крыніцы інфармацыі, кнігу ўжо трэба абараняць. У той жа час ён заўважыў тэндэнцыю, якая назіраецца апошнім часам, калі ўсё часцей людзі хочуць узяць у рукі “сапраўдныя, жывыя” кнігі, паразважаць над імі. “Неабходна прывіваць любоў да чытання, паказваць, наколькі гэта карысна і патрэбна, наколькі дапамагае засяродзіцца сучаснаму чалавеку, а не проста атрымліваць вялікую колькасць інфармацыі праз розныя месенджары”. Ён расказаў, што сёння Праваслаўная царква выдае шмат кніг, прысвечаных гістарычнай тэматыцы.
Падчас канферэнцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы працавала выстаўка праваслаўных выданняў. На ёй былі прадстаўлены кнігі, прысвечаныя Полацкаму



■ Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін прэзентуе новае выданне Нацыянальнай бібліятэкі – “Беларускі архіў старажытных грамат”

сабору 1839 года. Мітрапаліт звярнуў увагу на кнігі, падрыхтаваныя да 900-годдзя Свята-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра: “Адна з іх утрымлівае выявы адрэстаўраваных фрэсак і каментарыі, тым самым чытачу даецца магчымасць пазнаёміцца з гэтай найбагацейшай культурнай спадчынай беларускага народа. Ёсць кнігі, прысвечаныя тэме гісторыі Жыровіцкага манастыра, якія цікавыя тым, што перадаюць і гісторыю таго часу. Адна з кніг расказвае пра Жыровіцкі манастыр у кантэксце развіцця праваслаўя на беларускіх землях у дастаткова вялікі прамежак часу. Гэта ўсё гаворыць пра тое, што мы клапоцімся, каб духоўная спадчына захоўвалася ў добрай кнізе, якая будзе працаваць на тое, каб фарміраваць чалавека на аснове здабыткаў папярэдніх пакаленняў”.

## Святыні вяртаюцца

У канферэнцыі “Асвета беларускіх зямель праз праваслаўную кнігу. Юбілейныя даты Беларускай праваслаўнай царквы” разам са святарамі Беларускай Праваслаўнай Царквы ўзялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, камітэта Саюзнай дзяржавы, кіраўнікі мясцовых выканаўчых органаў, рэктары і студэнты духоўных і свецкіх ВНУ, дзеячы навукі і культуры.
Падчас сустрэчы Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак адзначыў, што ў сучаснай Беларусі ўзрастае роля Царквы. Аднаўляюцца і набываюць былую прыгажосць манастыры. Сёння яны зноў з’яўляюцца духоўнымі цэнтрамі для вернікаў. Дзень праваслаўнай кнігі, па яго словах, – мерапрыемства, якое прызвана нагадаць аб значэнні літаратуры ў нашым жыцці, аб тым, як трэба ўзбагачаць душу: “Духоўная кніга – крыніца мудрасці, якая можа нас направіць на добры шлях, натхніць на правільныя рашэнні ў складаных жыццёвых умовах”.
Прывітанне ўдзельнікам даслаў Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў: “Сёння наша агульная задача – прадстаўляць шырокай аўдыторыі інфармацыю аб гераічным мінулым нашых народаў, традыцый і культуры, аб тых духоўных скрэпах, якія звязваюць беларусаў і расіян. Такая работа становіцца сведчаннем таго, што праваслаўная вера і традыцыі аб’ядноўваюць народы Беларусі і Расіі”.
Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін расказаў аб супрацоўніцтве ўстановы з Беларускай Праваслаўнай Царквой, аб чым падпісана пагадненне. Дзякуючы гэтаму ўжо рэалізаваны шэраг розных праектаў: канферэнцыі, мерапрыемствы для самых юных наведвальнікаў, сустрэчы са святарамі ўнутры бібліятэкі. Падчас канферэнцыі ён прэзентаваў новае выданне Нацыянальнай бібліятэкі – “Беларускі архіў старажытных грамат” у дзвюх частках. Тут прадстаўлены дакументы, сабраныя праатаіерэем Іванам Грыгаровічам – беларускім праваслаўным святаром, археолагам і археографам, лінгвістам і літаратуразнаўцам. Першая частка “Беларускага архіва” была выдадзена ў 1824 годзе на сродкі мецэната графа Румянцава, а другая хоць і была падрыхтавана да друку, свету так і не пабачыла, больш за тое, пэўны час лічылася, што гэта літаратурная крыніца страчана. У ХХ стагоддзі яе знайшлі ў бібліятэцы ў Краснаярску, а сёння рукапіс захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі



На выстаўцы выданняў Беларускай Праваслаўнай Царквы

літаратуры і мастацтва ў Мінску. І вось праз 200 гадоў "Беларускі архіў старажытных грамат" Івана Грыгаровіча пабачыў свет.

Старшыня выдавецкага савета Беларускай Праваслаўнай царквы, протаіерэй Алег Кунцэвіч заўважыў, што дакументы пацвярджаюць, што пісьменства на беларускіх землях існавала з X стагоддзя. Самымі старажытнымі са знойдзеных на сёння з'яўляюцца Тураўскае Евангелле і Супрасльскі рукапіс. Пра тое, якая павага ў людзей да кнігі была ў старажытнасці, могуць сведчыць рукапісныя кнігі з уманціраванымі ў вокладку металічнымі ланцужкамі, дзякуючы якім кніга павінна была заставацца на адным месцы. Гэта было не проста спосабам захавання іх ад крадзяжоў, але і сведчаннем стаўлення да кнігі і ведаў, якія яна перадавала. Чалавек сам павінен быў прыйсці туды, дзе яна знаходзілася.

Натуральна, рарытэты не могуць быць даступнымі шырокаму колу грамадства, каб выправіць гэту сітуацыю, вярнуць старажытныя шэдэўры ў культурную і навуковую прастору, вядзецца работа над факсімільнымі выданнямі.

У 2009 годзе так было выпушчана Слуцкае Евангелле. Пасля Вялікай Айчыннай вайны кніга лічылася страчанай, але, калі святыня была знойдзена, Мітрапаліт Філарэт (Вахрамееў) прыклаў намаганні, каб свет пабачыла яе факсіміле. Гэта было першае такое выданне Беларускай Праваслаўнай Царквы, якое паклала пачатак цэлай серыі новых праектаў. У 2012 надрукавана факсіміле Жыція Прападобнай Еўфрасінні Полацкай. У аснове выдання ляжыць рукапіс сярэдзіны XVI стагоддзя, які захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. У 2013 годзе з'явілася факсімільная копія Полацкага Евангелля XII стагоддзя. Над яго стварэннем сумесна працавалі Нацыянальная бібліятэка Беларусі і выдавецтва беларускага экзархата, Нацыянальная акадэмія навук і Расійская дзяржаўная бібліятэка. Наступным праектам стала выданне буквара Спірыдона Собаля – першага такога падручніка на тэрыторыі Беларусі. Перавыданне стала магчымым дзякуючы супрацоўніцтву Беларускай Праваслаўнай царквы і Нацыянальнай акадэміі навук.

Жыровічскае Евангелле надрукавана ў 2020 годзе дзякуючы намаганням выдавецкага савета Беларускай праваслаўнай царквы і Нацыянальнай бібліятэкі. На сёння яно з'яўляецца самым багата аформленым з усіх вядомых захаваўшыхся рукапісных евангелляў, якія адносяцца да тэрыторый сучаснай Рэспублікі Беларусь. Адна з асаблівасцяў першакрыніцы, што на яе старонках знаходзіцца ўласнаручны запіс канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі аб дарэнні Жыровіцкаму манастыру некаторых зямельных і іншых уладанняў з датай 22 жніўня 1616 года.

Наогул з 2010 па 2024 год Беларускай Праваслаўнай Царквой было выдадзена больш за 140 кніг агульнай і гістарычнай тэматыкі.

Яўген **Кручкоў**

Фота БелТА